ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 27 (860) ● ЧАЦВЕР, 12 кастрычніка 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● ГОСЦІ УНІВЕРСІТЭТА ● ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ ● НА ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ БДУ ● У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА ● ГЕОГРАФЫ — СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ ● БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ.

# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ГЕРМАН СЦЯПАНАВІЧ!

Вестка аб тым, што ва універсітэце знаходзіцца касманаўт Герман Сцяпанавіч Цітоў, маланкай абляцела ўсе факультэты. І адразу пачаліся хваляванні: ці згодзіцца ён выступіць перад студэнтамі, бо праграмай яго паездкі ў саставе групы ўдзельнікаў міжнароднай сустрэчы прадстаўнікоў замежных таварыстваў дружбы з Савецкім Саюзам гэта не было прадугледжана.

Але ён згадзіўся. І вось на сцэну перапоўненай актавай залы падымаецца чалавек у ваеннай форме з зоркай Героя на грудзях. Мы, стоячы, апладзіруем. Без прадстаўлення яго пазналі ўсе: Герман Цітоў, такі, якім бачылі яго на здымках у газетах, на экранах тэлевізараў. Добры, адкрыты твар, шчырая ўсмешка, голас, што запамінаецца надоўга.

Ён пачынае гаварыць, і зала замірае. Кожны адчувае сябе шчаслівым. І не толькі таму, што прысутнічае на сустрэчы з выдатным чалавекам, а і таму, што Касманаўт-2 аказаўся іменна такім, якім яго і ўяўлялі, і хацелі бачыць.

Герман Сцяпанавіч расказвае аб развіцці савецкай касманаўтыкі, прыводзіць шмат цікавых фактаў. Пасля запуску першага спадарожніка зямлі, расказвае ён, Галоўны канструктар Сяргей Паўлавіч Каралёў сказаў, што чалавек паляціць у космас не раней чым праз 10 гадоў. А ўжо ў красавіку 1961 года ў космасе быў Юрый Гагарын.

Касманаўт-2 просіць прысутных задаваць пытанні. Расце на трыбуне гара лістоў, вырваных з канспектаў, з пытаннямі самых цікаўных людзей на зямлі — студэнтаў. Герман Сцяпанавіч адказвае на іх і сур'ёзна, і з гумарам.

**Пытанне:** Што адчувалі Вы, калі набліжаліся да зямлі?

**Адказ:** Асобых адчуванняў не было. Гэта была мая работа. Ну, вядома, хваляваўся ад таго, што мне даверылі такую вялікую справу.

**Пытанне:** Ці паляцяць зноў у космас жанчыны?

**Адказ:** Маё асабістае меркаванне: лепш было б, каб на сучасным этапе яны сустракалі нас кветкамі на Зямлі.

**Пытанне:** Як праходзіў Ваш палёт?

**Адказ:** Коратка я ўжо расказаў аб гэтым. Калі хто хоча даведацца падрабязней, няхай пазнаёміцца з маімі кнігамі: «17 касмічных зорак» і новай кнігай, якая хутка выйдзе ў ваенным выдавецтве, — «Мая блакітная планета».

**Пытанне:** Як Вы сябе адчуваеце?

**Адказ:** Вельмі добра. Думаю, што аб гэтым жа гаворыць пасведчанне, якое я маю: «Годзен да лётнай работы без абмежаванняў».

Сустрэча заканчваецца. Герман Сцяпанавіч Цітоў жадае студэнтам і выкладчыкам універсітэта поспехаў у вучобе і працы, шчасця і новых навуковых адкрыццяў. Хвалюючыся, падносіць касманаўту кветкі, прыгожыя ружы, дзяўчына. І зноў апладзіруе зала.

Л. ПЕРАСЫПКІНА.





**На здымках:** Г. С. Цітоў гутарыць з в'етнамскімі студэнтамі; удзельнікі міжнароднай сустрэчы прадстаўнікоў замежных таварыстваў дружбы з Савецкім Саюзам знаёмяцца з выстаўкай, прысвечанай 50-годдзю БДУ.
Фота **М. Нечыпарэнкі** і **Д. Чаховіча.**

# «ЭСТАФЕТА» ЎРУЧАНА

**У панядзелак на аб'яднаным пасяджэнні вучонага савета, парткома, мясцкома ва ўрачыстых абставінах акадэмік, Герой Сацыялістычнай Працы Антон Нічыпаравіч Сеўчанка перадаў рэктарскія паўнамоцтвы членукарэспандэнту АН БССР, прафесару Усеваладу Міхайлавічу Сікорскаму.**

**На пасяджэнні выступіў сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін. Ён з вялікай цеплынёй і павагай адзначыў заслугі Антона Нічыпаравіча ў развіцці фізічнай навукі, яго шматгранную, інтэнсіўную і плённую працу на пасадзе рэктара БДУ на працягу 15 год, вялікую грамадскую дзейнасць у якасці дэпутата Вярхоўнага Савета БССР. Ад імя Цэнтральнага Камітэта КПБ і ўрада рэспублікі А. Т. Кузьмін горача падзякаваў Антону Нічыпаравічу Сеўчанку за самаадданую і натхнёную працу і пажадаў яму добрага здароўя і новых поспехаў, плённай працы калектыву Інстытута прыкладных фізічных праблем, які ён узначальвае.**

**Са словам у адказ выступіў А. Н. Сеўчанка. Ён выказаў вялікую ўдзячнасць Цэнтральнаму Камітэту і Савету Міністраў БССР, усяму універсітэцкаму калектыву за вялікую дапамогу і падтрымку, якія ён адчуваў на нялёгкім рэктарскім пасту.**

**Прымаючы рэктарскую «эстафету», Усевалад Міхайлавіч Сікорскі падзякаваў ЦК КПБ і ўраду рэспублікі за аказанае давер'е і запэўніў іх, што калектыў універсітэта прыкладзе ўсе сілы да таго, каб і далей па праву несці сцяг флагмана вышэйшай адукацыі рэспублікі.**

**А. АЛЕНІЧ.**

## НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА

хімічных навук, якое адбылося на мінулым тыдні, у цэнтры ўвагі стаялі планы факультэта ў новым навучальным годзе. Была таксама заслухана справаздача аб рабоце метадычнай камісіі хімфака.

# ПРАЦАВАЦЬ З УСЁЙ ЭНЕРГІЯЙ

На мінулым тыдні камуністы універсітэта на сваім агульным сходзе абмеркавалі задачы па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне». З дакладам выступіў сакратар парткома М. К. ГАРБАЧОЎ. Ён падкрэсліў асаблівасці сучаснага этапу навукова-тэхнічнага прагрэсу і тыя патрабаванні, якія ставіць перад маладым спецыялістам бурнае развіццё прамысловасці і няспыннае яе пераасnашчэнне навейшай тэхнікай.

Падрабязна ахарактарызаваны меры, якія намечаны ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР па паляпшэнню работы вышэйшай школы. Так, ствараецца Савет вышэйшай школы пры Мінвузе СССР. Ён будзе выпрацоўваць навукова-абгрунтаваныя рэкамендацыі па паляпшэнню вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы, весці перспектыўнае планаванне падрыхтоўкі спецыялістаў, іх размеркаванне і выкарыстанне, клапаціцца аб павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў.

У буйных вузаўскіх цэнтрах ствараюцца саветы рэктараў вну, на якія ўскладаецца каардынацыя дзейнасці вну, абагульненне і пашырэнне станоўчага вопыту вучэбнай і выхаваўчай работы.

Пастанова патрабуе ўзняць ролю універсітэтаў у сістэме вышэйшай адукацыі і ператварыць іх у вядучыя вучэбна-метадычныя звенні вышэйшай школы. У адпаведнасці з пастановай будзе распрацавана новае палажэнне аб парадку замяшчэння прафесарска-выкладчыцкага саставу. Вызначаны меры па тэхнічнаму пераасnашчэнню вну, паляпшэнню завочнай і вячэрняй сістэм навучання, вытворчай практыкі, вучэбных планаў і праграм, павышэнню ролі грамадскіх арганізацый у рабоце вышэйшай школы.

Гаворачы аб практычных задачах калектыву універсітэта па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, М. К. Гарбачоў адзначыў, што яны павінны цесна ўвязвацца з перспектывамі развіцця БДУ ў дзевятай пяцігодцы.

Якія ж гэта перспектывы?

Пяцігадовым планам развіцця БДУ намечана давесці прыём у 1975 годзе на ўсе формы навучання да 3400 чалавек. Асабліва ўзрасце прыём на факультэт прыкладной матэматыкі; па спецыяльнасцях радыёфізіка і электроніка, палітэканомія і філасофія. З 1973 года будзе ўведзена новая спецыяльнасць — механіка.

Падрыхтоўчае аддзяленне вырасце са 150 да 350 чалавек. На завочныя падрыхтоўчыя курсы будзе прынята ў 1975 годзе 2500 чалавек.

Выпуск аспірантуры ў 1975 годзе павялічыцца на 45 чалавек.

Планам прадугледжана падрыхтоўка большай колькасці доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, выданне і перавыданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

У мэтах павышэння эфектыўнасці працы выкладчыкаў, паляпшэння вучэбнага працэсу намечана ўкараніць шырокі комплекс тэхнічных сродкаў навучання. Будуць кінафікаваны 12 кабінетаў і аўдыторый, абсталяваны чатыры лінгафонныя кабінеты, шырокае распаўсюджанне атрымае ў вучэбным працэсе тэлебачанне і машынная тэхніка.

Удасканаленне вучэбных планаў і праграм, структуры кіравання універсітэтам, укараненне ў вытворчасць навуковых распрацовак, ідэйна-палітычнае выхаванне студэнтаў займаюць важнае месца ў рабоце камуністаў і ўсяго калектыву БДУ.

Цяпер ва універсітэце 1100 камуністаў, якія аб'яднаны ў 19 партарганізацыях, 60 партыйных групах. Гэта вялікая сіла. Энергія яе павінна быць накіравана ў гэтыя дні на актыўную пад-

*(Пачатак. Заканчэнне на 2-й стар.).*

## ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ПАВЕДАМЛЯЕ

Адбылася нарада камсамольскага і прафсаюзнага актыву, на якой абмяркоўвалася пытанне: «Аб задачах камсамольскай арганізацыі па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па дальнейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне».

Пастанова партыі і Савецкага ўрада абавязвае студэнтаў універсітэта ўзмацніць барацьбу супраць троечнікаў, за павышэнне паспяховасці і культуры паводзін. Аб гэтым гаварыў у сваім дакладзе сакратар камітэта камсамола універсітэта Алег Слука. Ён акрэсліў таксама задачы, якія стаяць перад актывам у сувязі з правядзеннем справаздачна-выбарнай кампаніі.

Пра ход месячніка-агляду культуры паводзін і бытавых умоў студэнтаў гаварыў старшыня прафкома М. Дрозд. З адказамі на пытанні аўдыторыі выступілі намеснік загадчыка бібліятэкі З. А. Макеенка, намеснік сакратара парткома М. Д. Ціва і сакратар Акцябрскага райкома камсамола У. Навумчык.

* * *

Ва універсітэце праходзіць месячнік-агляд культуры паводзін і бытавых умоў студэнтаў. Усе факультэты ўключыліся ў работу па ўпарадкаванню вучэбных аўдыторый і інтэрнатаў, вядуць барацьбу за адпаведны знешні выгляд студэнтаў.

На мінулым тыдні амаль на ўсіх факультэтах кожны дзень перад пачаткам заняткаў працавалі камсамольскія пасты. Усе неахайныя студэнты атрымалі заўвагі, а тыя, хто спазніўся, не былі дапушчаны да заняткаў.

Толькі на юрыдычным факультэце 4 кастрычніка было затрымана 15 студэнтаў з доўгімі прычоскамі і тых, хто спазніўся на заняткі. На фізічным факультэце ў гэты ж дзень — 14 чалавек, хімічным — 9, некалькі чалавек на біяфаку. Што ж робяць камітэты камсамола, каб палепшыць становішча?

Фізікі ўзяліся за справу сур'ёзна. Было наладжана рэгулярнае дзяжурства на пастах. Усіх затрыманых строга папярэдзілі. Сярод іх было шмат першакурснікаў, таму тэрмінова сабралася нарада стараст груп І курса. Студэнты ІІ курса Урбановіч і Шэшла не прынялі да ўвагі папярэджанне дзяжурных, а Шэшла спрабаваў нават уцячы ад членаў камсамольскага паста. Таму камітэт камсамола паставіў перад дэканатам пытанне аб зняцці з гэтых студэнтаў стыпендыі. Камітэт камсамола юрыдычнага факультэта карыстаецца пакуль што метадам пераканання. Але студэнт ІІ курса Кулагін быў затрыман і чацвёртага і сёмага кастрычніка. Маральнага ўздзеяння тут не хапіла. Мабыць, трэба прымаць больш строгія меры да тых, хто не хоча прытрымлівацца парадку.

Месячнік працягваецца. Толькі тады будуць плённымі яго вынікі, калі мы ўсе разам будзем змагацца за высокую культуру нашага быту.

# ПРАЦАВАЦЬ З УСЁЙ ЭНЕРГІЯЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

рыхтоўку да 50-годдзя ўтварэння СССР, паспяховае выкананне ўзятых сацыялістычных абавязацельстваў.

***

Выступіўшыя ў спрэчках камуністы дапоўнілі даклад сакратара парткома, гаварылі аб канкрэтных задачах, якія патрабуюць тэрміновага вырашэння.

Член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар І. М. ЛУШЧЫЦКІ звярнуў увагу камуністаў на падрыхтоўку кадраў выкладчыкаў грамадскіх навук, на вялікую адказнасць універсітэта ў рашэнні гэтай праблемы. Камуніст І. М. Лушчыцкі крытыкаваў існуючую ва універсітэце сістэму падрыхтоўкі філосафаў і эканамістаў і выказаў меркаванне, што наспела пытанне аб стварэнні ў БДУ філасофска-эканамічнага факультэта.

Сакратар партбюро гістфака М. Г. ЕЛІСЕЕЎ гаварыў аб важнасці ўмелага вядзення ідэалагічнага выхавання студэнтаў, акцэнтавання ўвагі на індывідуальнай рабоце, падкрэсліў вялкіую ролю куратара ў пастаноўцы гэтай работы. З цікавасцю пазнаёміліся камуністы з вопытам прыцягнення студэнтаў да грамадскай дзейнасці. Намаганнямі дэканата, партбюро, таварыства «Веды» ў падшэфным Стаўбцоўскім раёне створан і паспяхова працуе універсітэт атэізму. У гэтым годзе будзе дзейнічаць семінар настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, лекторый міжнароднага жыцця. Студэнты выступяць перад працоўнымі з лекцыямі, гутаркамі, канцэртамі.

На фізічным факультэце вялікая ўвага аддаецца паляпшэнню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Аб гэтым гаварыў дэкан факультэта І. П. ЗЯЦЬКОЎ. Падабраны вельмі карысныя базы практыкі, дзе студэнты маюць справу з самым сучасным абсталяваннем і набываюць шырокі комплекс практычных ведаў. Супрацоўнікі факультэта сумесна з прадстаўнікамі прамысловасці распрацоўваюць новыя спецкурсы. Вялікіх поспехаў у арганізацыі новай спецыялізацыі дасягнулі кафедры фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, радыётэхнікі і фізічнай электронікі і іншыя.

Многа зроблена па ўдасканаленню метадычнай работы. І тут трэба адзначыць кафедру вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі.

І. П. Зяцькоў гаварыў аб недахопах і цяжкасцях, якія перашкаджаюць лепшай арганізацыі вучэбнага працэсу. Гэта адсутнасць новых планаў, аднабаковае рашэнне некаторых пытанняў, недахопы арганізацыйнага характару.

Загадчык вучэбнага аддзела В. С. ДАЛГАРУКАЎ прысвяціў сваё выступленне пытанням навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу, укаранення тэхнічных сродкаў, адзначыў тыя факультэты, дзе ёсць спробы строга вызначыць аб'ём вучэбнай нагрузкі студэнтаў, перагледзець пералік спецкурсаў, даць будучым спецыялістам сапраўды фундаментальныя сучасныя веды.

Асаблівай увагі патрабуе лектарскае майстэрства выкладчыкаў, гаворыць В. С. Далгарукаў. Сярод выкладчыкаў многа моладзі, якая недастаткова валодае методыкай выкладання. Мэтазгодна было б стварыць у нас універсітэт педагагічнага майстэрства.

Акадэмік А. Н. СЕЎЧАНКА сканцэнтраваў увагу на падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі на факультэтах, адзначыў поспехі ў гэтым напрамку фізікаў, хімікаў, якія, дарэчы, выконваюць вялікі аб'ём работ па гаспадарчых дагаворах, выказаў крытычныя заўвагі ў адрас матэматычнага факультэта.

Гаворачы аб перспектывах развіцця універсітэта, росце яго матэрыяльнай базы, А. Н. Сеўчанка вызначыў тыя ўчасткі, дзе патрэбна асабліва настойліва папрацаваць камуністам. І, у прыватнасці, выхаваўчая работа сярод студэнтаў патрабуе самай пільнай увагі. Выхоўваць студэнцтва павінны ўсе, ад асістэнта да прафесара.

Прааналізаваў стан спраў завочнага і вячэрняга навучання ва універсітэце прарэктар У. Р. ІВАШЫН. Ён паведаміў вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі, адзначыў, што паспяховасць, якую паказалі студэнты (вячэрнікі — 80,5 працэнта, завочнікі — 70) выклікае вялікую заклапочанасць. Яна павінна передацца і калектывам кафедр. Дзіўна, гаворыць У. Р. Івашын, што з году ў год на адных і тых жа кафедрах ад 30 да 40 працэнтаў студэнтаў атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі, і гэта не хвалюе калектывы кафедр, камуністаў, не прымушае іх адшукаць прычыны такога становішча.

Шмат выкладчыкаў на вячэрніх аддзяленнях і завочным факультэце працуюць на ўмовах пагадзіннай аплаты. Многія выкладчыкі не ўлічваюць спецыфіку вучэбнай работы. Часта лекцыі іх маюць істотныя недахопы. У выніку — скаргі студэнтаў. Загадчыкі ж некаторых кафедр на працягу года не наведалі ні адных заняткаў сваіх выкладчыкаў.

Шмат цяжкасцей звязана з дрэнным забеспячэннем студэнтаў літаратурай. Супрацоўнікам бібліятэкі трэба падумаць, як набыць больш падручнікаў, а кафедрам — абмеркаваць магчымасці выдання патрэбнай вучэбнай і метадычнай літаратуры.

***

Пастанова, прынятая партыйным сходам, канкрэтызавала задачы камуністаў БДУ, абавязала іх накіраваць намаганні на выкананне пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» з улікам перспектыў развіцця універсітэта ў бягучай пяцігодцы.





*⊙ Практычныя заняткі па матэматычнаму аналізу ў студэнтаў І курса ФПМ. Вядзе іх ст. выкладчык Ю. Б. Сыраед (на здымку ўнізе справа).*

# ПЛЁННАЯ САДРУЖНАСЦЬ

З кожным годам мацнее сяброўства паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна і Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР). Ужо традыцыйнымі сталі ўзаемны абмен рознымі студэнцкімі дэлегацыямі, паездкі прафесараў, выкладчыкаў у сяброўскія універсітэты. Дагавор аб садружнасці паміж дзвюма вну ў значнай ступені стымуляваў развіццё навуковых сувязей.

У верасні ў нашым універсітэце гасцілі кіраўнік аддзела іёнаметрыі Іенскага універсітэта дацэнт, доктар Г. Гетц і кіраўнік адной з лабараторый доктар І. Міттэнбахер — спецыялісты па іённай імплантацыі. Гэта зусім новы навукова-тэхнічны напрамак, які сфарміраваўся на стыку фізікі атамных сутыкненняў і фізікі цвёрдага цела (у прыватнасці, фізікі паўправаднікоў), які мае вялікае прыкладное значэнне, асабліва для паўправадніковай мікраэлектронікі.

Знаходжанне ў Мінску нямецкіх спецыялістаў супала з работай Усесаюзнага сімпозіума па радыяцыйных дэфектах у паўправадніках, праходзіўшага ў БДУ. Даклад, з якім выступіў на сімпозіуме доктар Г. Гетц, выклікаў значную цікавасць сярод удзельнікаў. Вельмі жыва і плённа прайшлі семінары на кафедры фізікі цвёрдага цела з удзелам гасцей з Іены і раду вядучых вучоных з Масквы і іншых гарадоў нашай краіны, якія займаюцца праблемамі іённай імплантацыі.

Шмат часу нямецкія сябры прысвяцілі знаёмству з навуковай работай, праводзімай у лабараторыях кафедр фізікі цвёрдага цела, фізікі паўправаднікоў і Інстытута прыкладных фізічных праблем. Яны былі прыняты прарэктарам па навуковай рабоце прафесарам Л. В. Валадзько і дэканам фізічнага факультэта дацэнтам І. П. Зяцьковым, гутарылі з прафесарам В. Д. Ткачовым, дацэнтам Г. А. Гуманскім. Пад канец візіту быў распрацаван і зацверджан план сумесных навуковых даследаванняў па праблемах, якія маюць узаемны інтарэс. Гэтае супрацоўніцтва дазволіць аб'яднаць намаганні і паўней выкарыстаць існуючыя магчымасці для рашэння раду важных навукова-тэхнічных задач.

Несумненна, вынікі візіту з'явяцца далейшай вяхой на шляху ўмацавання дружбы і супрацоўніцтва паміж нашымі універсітэтамі.

**В. САЛАЎЁЎ,**
**ст. навуковы супрацоўнік.**

## НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

# У ІНТАРЭСАХ

**«...Далейшая праграма развіцця эканомікі Савецкага Саюза ў цэлым і галін гаспадаркі паасобку павінна ажыццяўляцца на аснове глыбокіх комплексных даследаванняў, суправаджацца навуковымі прагнозамі магчымых вынікаў і абавязковай сістэмай мераприемстваў, якія выключаюць шкоднае ўздзеянне на навакольнае прыроднае асяроддзе. Наш абавязак — захаваць і памножыць для пакаленняў, якія будуць жыць у камуністычным грамадстве, усе багацці і прыгажосць прыроды».**

(З пастановы Вярхоўнага Савета СССР «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню аховы прыроды і рацыянальнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў»).

У сувязі з узрастаючай індустрыялізацыяй, хімізацыяй сельскай гаспадаркі, ростам насельніцтва, урбанізацыяй, меліярацыяй глеб і г. д. узрастае ступень уздзеяння чалавека на прыродныя ўмовы. Узнікаюць новыя ландшафты з уласцівымі ім заканамернасцямі і часта няўстойлівымі сувязямі паміж асобнымі кампанентамі. У гэтых умовах вялікае значэнне набывае задача комплекснага вывучэння, аховы і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. У рашэнні гэтай задачы ўдзельнічае створаная ў сакавіку 1972 г. на геаграфічным факультэце праблемная лабараторыя меліярацый ландшафтаў. Яна арганізавана на базе існаваўшай пры кафедры глебазнаўства лабараторыі біягеахіміі глеб.

Акрэслены асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў лабараторыі:

— вывучэнне ўплыву меліярацый, у тым ліку асушальных работ, у заходняй частцы падзоны змешаных лясоў СССР на дынаміку ўрадлівасці глебы;

— вывучэнне змен прыродных і культурных ландшафтаў з мэтай стварэння працягла ўстойлівых экалагічных сістэм, прыгодных для выкарыстання ў сельскай і лясной гаспадарцы;

— вывучэнне працэсаў ветравой і біялагічнай эрозіі на меліяраваных тэрыторыях;

— распрацоўка рэкамендацый па гаспадарчаму асваенню ландшафтаў і іх ахове.

У адпаведнасці з навуковымі напрамкамі ў саставе лабараторыі маюцца тры сектары: глебавых і эразійных даследаванняў — навуковы кіраўнік член-карэспандэнт АН БССР прафесар А. Г. Мядзведзеў; фізіка-геаграфічных ландшафтных даследаванняў — навуковы кіраўнік прафесар В. А. Дзяменцьеў; эканомгеаграфічных ландшафтных даследаванняў — навуковы кіраўнік дацэнт І. І. Трухан. Агульнае навуковае кіраўніцтва ўскладзена на савет лабараторыі, які ўзначальвае дэкан геаграфічнага факультэта прафесар М. Т. Раманоўскі.

Праблемная лабараторыя аб'ядноўвае навуковыя сілы факультэта для рашэння важных праблем і ў той жа час стане добрай вучэбнай базай для праходжання практыкі, выканання курсавых і дыпломных работ, правядзення даследаванняў студэнтамі-географамі.

У даследаваннях лабараторыі будуць удзельнічаць выкладчыкі кафедр глебазнаўства, фізічнай геаграфіі СССР і эканамічнай геаграфіі СССР, а таксама больш 100 студэнтаў старэйшых курсаў.

Пэўныя асновы навуковай працы ствараюць папярэднія даследаванні. Лабараторыяй біягеахіміі глеб, на базе якой створана праблемная лабараторыя, з 1963 г. праводзіліся даследаванні мікраэлементаў у глебах БССР і эфектыўнасці мікраўгнаенняў, працэсаў воднай і ветравай эрозіі; складзены картаграмы ўтрымання мікраэлементаў у глебах БССР, распрацаваны рэкамендацыі па прымяненню мікраўгнаенняў і адобраны Міністэрствам сельскай гаспадаркі. Па методыцы, складзенай прафесарам А. Г. Мядзведзевым сумесна з Беларускім навукова-даследчым інстытутам глебазнаўства, праведзена баніціроўка глеб калгасаў, саўгасаў, раёнаў і абласцей Беларусі. Дадзены рэкамендацыі па выкарыстанню матэрыялаў баніціроўкі для ацэнкі гаспадарчай дзейнасці калгасаў, саўгасаў, раёнаў і планавання сельскагаспадарчых закупак. Па матэрыялах даследаванняў апублікаваны манаграфіі: «Мікраэлементы ў глебах БССР і эфектыўнасць мікраўгнаенняў» (1970 г.), «Якасная ацэнка зямель у калгасах і саўгасах БССР» (1971 г.). Прафесар А. Г. Мядзведзеў склаў прагноз змен глебы ў сувязі з меліярацыяй на 1980 год як частку агульнага прагнозу па Беларускаму Палессю. Вынікі даследаванняў ветравой эрозіі на меліяраваных глебах паведамлены ў 1970 годзе на пасяджэнні навуковага савета «Вывучэнне навакольнага асяроддзя чалавека і рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў біясферы» пры Дзяржкамітэце Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы.

У цяперашні час лабараторыяй праводзяцца даследаванні глеб у ландшафтах Беларускага Палесся, іх змен пад уплывам асушальнай меліярацыі.

Асушэнне глеб рэзка мяняе напрамак глебаўтварэння. Замест накаплення арганічнага рэчыва ў тарфяна-балотных глебах адбываецца яго інтэнсіўная мінералізацыя. Памяншэнне слою торфу меліяраваннем глеб, уключаючы мінералізацыю, выдуванне ветрам і ўшчыльненне складае ў сярэднім 1—3 см у год, г. зн. магутнасць торфу штогод памяншаецца на 1—3 см. А так як у Беларускім Палессі пераважаюць маламагутныя тарфяныя глебы (да 1 м), то пасля асушэння яны недаўгавечныя. Па прагнозу да 2050 года, калі не прыняць мер да захавання слою торфу, на Палессі знікнуць у асноўным тарфяныя глебы. Яны ператворацца ў нізкаўраджайныя мінеральныя пясчаныя глебы. Ёсць шмат прыкладаў, калі ў выніку меліярацый зніклі тарфяныя глебы. Сортаўчастак у Кастрычніцкім раёне Гомельскай вобласці давялося пераносіць на другое месца, таму што пры працяглым выкарыстанні пад ворывам асушаных тарфяных глеб спрацаваўся тарфяны гарызонт глеб. Даследаванні на ўчастку Палескай вопытнай балотнай станцыі Брэсцкай вобласці паказалі, што магутнасць торфу паменшылася з 61 см у 1964 г. да 43 см у 1971 г. За гэты час плошча глебы магутнасцю торфу больш 0,5 м паменшылася на 31 працэнт, а магутнасцю да 0,3 м узрасла на 30 працэнтаў. Па прагнозу на 1980 год пераважнымі будуць глебы з магутнасцю торфу да 0,3 м, а колькасць глебавых контураў павялічыцца з 33 да 51, г. зн. узрасце стракатасць глебавага покрыву.

У розных ландшафтах меліярацыя па рознаму ўплывае на прылягаючыя тэрыторыі. Так, на водна-ледніковых раўнінах, складзеных магутным пяском, паніжэнне ўзроўню грунтовых вод пры меліярацыі выклікае паніжэнне яго на павышаных прылягаючых тэрыторыях, на якіх інтэнсіўна праяўляецца ветравая эрозія глебы. У ландшафтах жа доннамарэнных раўнін, складзеных маламагутнымі пяскамі, якія падсціляюцца на глыбіні каля 1 м марэннымі суглінкамі, асушэнне нізін істотна не адбілася на ўзроўні грунтовых вод павышэнняў і ўрадлівасці глебы на іх.

У Гомельскай вобласці, дзе меліярацыя праводзіцца даўно, далі адбітак разам з асноўнымі станоўчымі бакамі меліярацыі і яе адмоўныя вынікі. Аналіз зямельнага фонду тут паказаў, што плошча меліяраваных глеб за прайшоўшае пяцігоддзе павялічылася на 127 тыс. га, а плошча палёў скарацілася на 40 тыс. га. Скарачэнне плошчы ворнай зямлі, нягледзячы на павелічэнне меліяраваных зямель, тлума-







# У АБ'ЕКТЫВЕ — ВУЧОБА

⊙ *Пад кіраўніцтвам асістэнта кафедры аналітычнай хіміі Л. І. Севасцьянавай праводзяць даследаванні па якаснаму аналізу студэнты II курса хімфака.*
*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

*ПАРАДЫ ПЕРШАКУРСНІКУ*

# ЯК ПРАЦАВАЦЬ НАД ПЕРШАКРЫНІЦАМІ

Лепшы спосаб запомніць прачытанае — гэта коратка запісаць на паперы асноўныя думкі і палажэнні аўтара. Запісы могуць быць некалькіх відаў. Часта ўжо сама тэма, характар і пабудова вывучаемага твора падказваюць від запісу, з якіх найбольш распаўсюджаны наступныя: план просты і разгорнуты, тэзісы, выпіскі, канспект, рэферат.

**ПЛАН.** Пытанні, разглядаемыя ў творы, пералічваюцца ў паслядоўным, лагічна абгрунтаваным парадку. Уяўленне аб асноўных пунктах такога плана дае азагалоўліванне кнігі. Часам назвы глаў або раздзелаў можна выкарыстаць у якасці простага плана, а назвы параграфаў — у якасці разгорнутага.

Для складання плана неабходна перш за ўсё ўважліва прачытаць увесь твор, прадумаць яго, стараючыся ўстанавіць, якім планам карыстаўся аўтар пры напісанні асобных глаў і раздзелаў. Затым ужо план запісваецца ў выглядзе кароткіх фармуліровак.

**ТЭЗІСЫ.** Тэзісы істотна адрозніваюцца ад плана. Яны коратка фармуліруюць асноўныя палажэнні кнігі або артыкула і, такім чынам, перадаюць іх змест. Складанне тэзісаў дапамагае глыбей зразумець асноўныя ідэі твора, выдзеліць самае галоўнае. Гэта прывучае коратка і адначасова дакладна фармуліраваць думку, павышае культуру пісьма.

Тэзісы таксама бываюць двух відаў: простыя — тыя, якія не ўключаюць у сябе аргументацыю, доказы і могуць складацца толькі з асноўных палажэнняў, і складаныя, якія тлумачаць фармуліроўкі.

Перш чым прыступіць да складання тэзісаў, неабходна прачытаць увесь твор, калі ён невялікі, або адну главу, калі прачытаць увесь твор адразу цяжка. Пасля, калі ўжо сталі зразумелымі ідэі ўсёй работы або асобных яе частак, яны коратка і паслядоўна выкладваюцца ў выглядзе пунктаў. Кожны пункт мае характар сцвярджэння (па-грэчаску «тэзо» азначае «сцвярджаю»). Класікі марксізму-ленінізму шырока карысталіся тэзісамі ў тых выпадках, калі хацелі асабліва коратка, выпукла і выразна сфармуляваць свае думкі, асноўныя палажэнні. Класічным прыкладам з'яўляюцца вядомыя «Красавіцкія тэзісы» У. І. Леніна, а таксама «Тэзісы ЦК КПСС да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Асобны від запісу ўяўляюць выпіскі. Іх лепш рабіць не ў сшытках, а на асобных лістах і картачках.

**КАНСПЕКТ.** Найбольш дасканалым і распаўсюджаным відам запісу прачытанага з'яўляецца канспект (ад лацінскага «канспектус» —агляд). Канспект уключае ў сябе ўсе іншыя віды запісу. Прычым яго можна дапоўніць матэрыяламі і фактамі, узятымі не з адной, а з многіх крыніц. Канспект некалькіх твораў на адну тэму называецца тэматычным. Ён ужо блізкі да рэферата.

Пры асэнсаваным канспектаванні ў студэнта працуюць зрокавая і маторная памяць. Матэрыял засвойваецца трывала і надоўга.

Хочацца даць некалькі практычных парад. Прыступаючы да складання канспекта, трэба спачатку запісаць прозвішча аўтара, поўную назву твора, год выдання. Калі гэта артыкул, то ўказаць нумар часопіса або зборніка. У тэксце канспекта трэба адзначыць старонкі канспектуемага твора на выпадак, калі неабходна будзе хутка знайсці патрэбныя месцы. На старонках пакідаюцца палі для далейшага папаўнення канспекта.

# ГАСПАДАРКІ

чыцца пагаршэннем часткі стараворных зямель у выніку меліярацыі прылягаючых тэрыторый і спісаннем іх пад лес. Акрамя таго, частка палёў невысокай ураджайнасці пераводзіцца ў іншыя сельскагаспадарчыя ўгоддзі і пад лес. Палі таксама адводзяцца пад прамысловае, гарадское, дарожнае будаўніцтва і г. д.

Супрацоўнікі лабараторыі заклалі стацыянарныя ўчасткі па вывучэнню змен глебы пад уплывам меліярацыі і хімізацыі. Штогод праводзяцца тры экспедыцыі агульнай працягласцю два месяцы ў Беларускае Палессе для палявых даследаванняў прыродных умоў.

Пад кіраўніцтвам прафесара В. А. Дзяменцьева калектыў кафедры фізічнай геаграфіі СССР даследаваў і закартаваў ландшафты паўночнай і цэнтральнай Беларусі, распачата вывучэнне ландшафтаў, выяўлена іх структура і вывучаецца дынаміка. Даследаванні дазволілі вызначыць адрозненні ў асноўных ландшафтах і характар іх змен пад уплывам меліярацый. Вывучэнне ландшафтаў у прыгараднай зоне Мінска завяршылася распрацоўкай методыкі ацэнкі ландшафтаў для архітэктурнага праектавання прыгарадных зон, арганізацыі масавага адпачынку насельніцтва гарадоў і правядзення неабходных мер па ахове прыроды.

Прафесарам А. Х. Шклярам праведзена аграклiматычнае раяніраванне тэрыторыі рэспублікі, вывучаны асаблівасці мікраклімату асушаных тарфянабалотных глеб.

Кафедрай эканамічнай геаграфіі пад кіраўніцтвам дацэнта І. І. Трухана вывучан уплыў прыродных умоў на спецыялізацыю і кошт сельскагаспадарчай прадукцыі на прыкладзе Віцебскай вобласці, складзены атласы сельскай гаспадаркі ўсіх абласцей рэспублікі, вывучаюцца асаблівасці размяшчэння і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі і прамысловасці па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны.

У далейшым плануецца распрацаваць доўгатэрміновы прагноз змянення ландшафтаў пад уплывам меліярацый на прыкладзе асобных раёнаў заходняй часткі падзоны змешаных лясоў СССР, даць рэкамендацыі па выкарыстанню ландшафтных карт для меліярацый ландшафтаў, размяшчэння зон адпачынку, арганізацыі запаведнікаў і сельскагаспадарчай планіроўкі. Вывучэнне змен уласцівасцей глебы пад уплывам меліярацый і дынамікі сучасных глебаўтвараючых працэсаў дазволіць стварыць аптымальныя рэжымы развіцця культурнай раслiннасці, даць прагноз змен глеб і іх ураджайнасці і рэкамендацыі па змяншэнню інтэнсіўнасці мінералізацыі арганічнага рэчыва меліяраваных глеб.

Даследаванні дазволяць, зыходзячы з ландшафтных асаблівасцей, выявіць раёны эканамічна мэтазгоднай вытворчасці прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі, вызначыць спецыялізацыю гаспадарак для розных прыродных ландшафтаў, выявіць патэнцыяльныя магчымасці пашырэння сельгасугоддзяў і вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў у розных ландшафтах.

Вядома, поспех гэтых работ будзе залежаць ад забеспячэння іх фінансавымі і матэрыяльнымі сродкамі. Так, цяпер праблемная лабараторыя адчувае цяжкасці ў правядзенні навукова-даследчых работ. Нешматлікі штат — 12 супрацоўнікаў — не дазваляе забяспечыць даследаванні па ўсіх навуковых напрамках. Вельмі неабходна павялічыць штат хоць бы на шэсць адзінак. Вострую патрэбу мае лабараторыя ў дадатковай рабочай плошчы. Цяпер абмежаваныя ўмовы не даюць магчымасці выкарыстаць каштоўныя прыборы.

**С. ЗАЙКО,**
**загадчык праблемнай лабараторыі меліярацый ландшафтаў.**

# У ДАЛЁКІМ ПАДАРОЖЖЫ

У ЖНІЎНІ 1972 г. у саставе маладзёжнай турысцкай групы я пабываў у Іспаніі. Безумоўна, тыднёвае знаходжанне ў гэтай цікавай краіне надзвычай малы тэрмін для таго, каб атрымаць грунтоўныя, шматбаковыя ўражанні, тым больш, што турыстам у Іспаніі паказваюць у асноўным помнікі архітэктуры, музеі, пляжы і г. д. Сустрэч жа з моладдзю, з працоўнымі краіны першакласная турысцкая фірма, прымаўшая нас, не прадугледзела. І гэта можна зразумець, калі ўспомніць аб існуючым у краіне палітычным рэжыме, аб той дыктатуры, якую ўстанавіў пасля грамадзянскай вайны Франка. Але незадавальненне існуючым палітычным становішчам у краіне не хавалі пры сустрэчах з намі тыя выпадковыя субяседнікі, з якімі мы размаўлялі і якія праяўлялі жывы інтарэс да нашай краіны, да нашых значкоў, сувеніраў.

Цікавая гісторыя, мноства розных помнікаў мінулага вывелі Іспанію ў цяперашні час на першае месца ў капіталістычным свеце па прыёму турыстаў. Жыхары многіх яе гарадоў, такіх, як Таледа—старажытная сталіца Іспаніі, Сегавійя, Авіла, існуюць у асноўным за кошт абслугоўвання турыстаў, вырабу і продажу сувеніраў, рэкламы каштоўных вартасцей і дэманстрацыі нацыянальных асаблівасцей.

Першым горадам, які мы наведалі, быў Мадрыд — сталіца Іспаніі. Гэта трохмільённы горад з сучаснымі будынкамі, помнікамі, фантанамі і яркімі рэкламамі.

Канешне ж, мы пабывалі ў музеі Прадо, дзе сабраны шэдэўры кісці Гойі, Веласкеса, Эль Грэка. Іх творы мы бачылі і ў шматлікіх каталіцкіх саборах розных гарадоў, якія нам ахвотна прапаноўвалі наведаць. Усе яны вызначаюцца буйнагабарытнасцю, пампезнасцю, чалавек у іх павінен адчуваць сябе нікчэмным. Каталіцызм у Іспаніі і цяпер служыць надзейнай апорай Франка.

Некалькі дзён мы жылі ў Барселоне, буйнейшым міжземнаморскім порце. Гэта другі па велічыні і значэнню горад Іспаніі. Ён выразна падзяляецца на новую і старую часткі. Старая частка прымыкае да набярэжнай, над якой узвышаецца 60-метровы помнік Калумбу. Тут жа стаіць ля прычала дакладная копія каравелы «Санта-Марыя», на якой Калумб плаваў у Амерыку і вярнуўся ў Барселону, дзе ён далажыў аб сваім адкрыцці каралеўскаму двару.

У Барселоне мы ўбачылі так званую «іспанскую вёску», пабудаваную ў 1922 годзе для міжнароднай выстаўкі. У ёй прадстаўлены ўзоры архітэктуры, вырабаў, паказаны звычаі ўсіх правінцый Іспаніі. Наведалі мы і музей Пікасо. Мастак жыў у Барселоне да 18—20-гадовага ўзросту, а пасля пераехаў у Парыж. У гэтым музеі прадстаўлена ранняя творчасць Пікасо, менш вядомая.

Прыемнае ўражанне выклікаюць каталонскія народныя танцы, якія выконваліся на вуліцах вячэрняй Барселоны.

Іспанія — краіна цяпла і сонца. І, вядома, вялікае задавальненне прынесла нам наведанне міжземнаморскіх пляжаў у Коста-Брава і Барселоне.

У адзін з дзён, заплаціўшы звычайны для капіталістычных краін дарожны збор (па 340 песет пры выездзе і ўездзе ў Мадрыд), мы зрабілі аўтобусную экскурсію ў Таледа. Гэта — горад-музей. Шматлікія яго замкі і саборы ўпрыгожаны лепшымі творамі Эль Грэка. Там мы пабывалі ў майстэрні, дзе рабочыя вырабляюць розныя сувеніры, уручную сплятаючы цудоўныя ўзоры з тонкага залатога і сярэбранага дроту. Іх заработная плата знаходзіцца ў прамой залежнасці ад збыту прыгатаваных рэчаў. А жыццё ж у капіталістычнай краіне, у тым ліку і ў Іспаніі, патрабуе платы за ўсё. Нам нават цяжка было ўявіць сабе той вялікі пералік плацяжоў. Прывяду толькі адзін прыклад. Аперацыя апендыцыту каштуе ў Іспаніі 30 тыс. песет пры мінімальнай заработнай плаце ў 4,5 тысячы.

Расказваючы аб Іспаніі, нельга абыйсці маўчаннем карыду. Гэта абавязковая частка ўсіх турысцкіх маршрутаў. 22 тысячы гледачоў збіраецца на карыду ў Барселоне. Відовішча шырока рэкламіруецца. Іспанскія гледачы вядуць сябе на трыбунах вельмі ажыўлена. Відаць, што ў гэтых прадстаўленнях яны ведаюць толк і любяць іх. Але для іншаземцаў, у тым ліку і для нас, карыда перш за ўсе паварочваецца жорсткасцю, здзеклівым забойствам быкоў. Працэс гэты абстаўлен вельмі ўрачыста, артыстычна, у рашаючыя моманты іграе аркестр. Але каб поўнасцю захапіцца гэтым відовішчам, трэба быць, напэўна, іспанцам. Нашы пачуцці тут аказаліся непадрыхтаванымі.

Безумоўна, у гэтай паездцы мы бачылі значна больш. Сім-тым захапляліся, сім-тым абураліся. І тым больш прыемным было вяртанне на Радзіму.

**В. ПРАКОШЫН,**
**дацэнт.**

---

Сёння з 14 да 19 гадзін ў 421-й аўдыторыі супрацоўнікамі бібліятэкі арганізуецца адкрыты прагляд літаратуры па матэматыцы. Будуць прадстаўлены працы, вучоныя запіскі, матэрыялы нарад, сімпозіумаў, канферэнцый. Запрашаем на прагляд.

# ПРЫСВЕЧАНА ДРУЖБЕ ЛІТАРАТУР

**Беларуска - украінскія, як і беларуска - рускія літаратурныя сувязі, сягаюць у глыбіню стагоддзяў. Аднак толькі сто гадоў назад пачалося іх навуковае даследаванне. Нямала зрабілі дарэвалюцыйныя вучоныя: яны заклалі трывалы падмурак беларусістыкі на Украіне і украіністыкі — у Беларусі. Прыгадаем хаця б працу украінца І. Свянціцкага «Адраджэнне беларускага пісьменства» і артыкулы М. Багдановіча «Галіцкая Русь», «Угорская Русь», «І. Франко», «Ул. Самійленка» і інш. І усё ж толькі ў гады Савецкай улады разам з роcквітам нацыянальных культур і наладжваннем цесных міжрэспубліканскіх культурных сувязей даследаванне беларуска - украінскага літаратурнага ўзаемадзеяння набывае небывала шырокі, планамерны характар. Асабліва шмат зроблена ў пасляваенны час: па гэтай тэме з'явіліся дзесяткі навуковых публікацый, кніг, абаронены адна доктарская (П. П. Ахрыменкам) і дзве кандыдацкія дысертацыі (Э. М. Мартынавай і Т. В. Кабржыцкай).**

**Важнай падзеяй азнаменаван 1969 год: у Гомельскім універсітэце адбылася Першая навуковая канферэнцыя па вывучэнню беларуска - украінскіх літаратурных і фальклорных сувязей. Нягледзячы на тое, што канферэнцыя была першай, па сутнасці арганізацыйнай, яна ўнесла відавочнае ажыўленне ў працэс міжрэспубліканскіх культурных кантактаў.**

**І вось — Другая канферэнцыя. Яна праходзіла 29—30 верасня 1972 года ў Львове — горадзе, дзе, уласна, і заснавалася спецыяльнае вывучэнне беларуска - украінскіх літаратурных сувязей. Канферэнцыя прысвечана 50-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэтая акалічнасць абумовіла некаторую своеасаблівасць праблематыкі навуковых дакладаў і паведамленняў — амаль усе яны датычалі сувязей савецкага часу. За два дні выступіла дваццаць пяць вучоных з Львова і Гомеля, Мінска і Жытоміра, Нежына і Палтавы, Гродна і Чарнаўцоў, Кіева, Слуцка, Роўна і некаторых іншых украінскіх і беларускіх гарадоў. З цікавасцю былі выслуханы даклады прафесара Гомельскага універсітэта П. П. Ахрыменкі «Гістарычная абумоўленасць і значэнне украінска - беларускіх літаратурных узаемасувязей», дацэнта Львоўскага універсітэта імя І. Франко І. А. Дзенісюка «Тыпалагічныя сувязі ў сучаснай украінскай і беларускай навелістыцы», навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры АН БССР Э. М. Мартынавай «Шаўчэнка на беларускай мове», старшага навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры АН УССР Л. М. Каваленкі «Андрэй Малышка і беларуская літаратура». Нямала новых, часам нечаканых фактаў і назіранняў змяшчалі ў сабе выступленні дацэнта Нежынскага пэдінстытута Г. Я. Нядзелькі «Францішак Багушэвіч на Украіне», навуковага супрацоўніка Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР М. В. Кабржыцкай «В. А. Сухамлінскі і Беларусь», дацэнта Харкаўскага універсітэта У. А. Дарашэнкі «Паэзія А. Куляшова ва украінскіх перакладах», настаўніка са Слуцка Р. М. Радчанкі «Альгерд Абуховіч і Пятро Карповіч», старшага выкладчыка Львоўскай кансерваторыі Р. П. Зарыўчак «Слова Лесі Украінкі ў беларускім гучанні».**

**Ад БДУ імя У. І. Леніна на канферэнцыі з дакладамі выступілі супрацоўнікі кафедры беларускай літаратуры прафесар А. А. Лойка («Маладая беларуская і украінская паэзія 60-х гг.»), дацэнты К. Р. Хромчанка («Беларуска - украінскія літаратурныя сувязі 20-х гг.») і аўтар гэтых радкоў («Максім Танк на украінскай мове»). Трэба сказаць, што на гэтай універсітэцкай кафедры даследаванню беларуска - украінскіх літаратурных сувязей удзяляецца значная ўвага. Каб пераканацца ў гэтым, варта разгарнуць кнігі прафесара М. Р. Ларчанкі «Славянская супольнасць», доктара філалагічных навук С. Х. Александровіча «Старонкі братняй дружбы», працы іншых супрацоўнікаў кафедры. Для студэнтаў арганізаваны семінар па беларуска-украінскіх узаемасувязях, украінскай літаратуры адведзена пераважная колькасць гадзін у курсе літаратур народаў СССР, што чытаецца на філалагічным факультэце.**

**Творчасць украінскіх пісьменнікаў становіцца нярэдка тэмай дыпломных работ выпускнікоў філфака. Усё гэта цалкам вытлумачвае з'яўленне даклада «Украіністыка ў Беларускім універсітэце», з якім выступіла на канферэнцыі дацэнт Львоўскага універсітэта Л. І. Мішчанка. Прыемна было пачуць, што універсітэцкія вучоныя не толькі даследуюць гісторыю літаратурнай дружбы двух савецкіх народаў, але і ўносяць самі важкі ўклад у яе ўмацаванне і развіццё. Так, А. Лойка, Н. Гілевіч і іншыя перакладаюць на беларускую мову творы украінскіх пісьменнікаў. У той жа час вершы і апавяданні некаторых пісьменнікаў - выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта (І. Навуменкі, А. Лойкі, Н. Гілевіча) перакладзены на украінскую мову, цёпла ўспрыняты украінскім чытачом. Шкада, што не было прачытана аналагічнага даклада, прысвечанага беларусістыцы, у Львоўскім універсітэце, які разам з Інстытутам грамадскіх навук АН УССР арганізаваў канферэнцыю. Як вядома, на кафедры украінскай літаратуры універсітэта нямала зроблена па даследаванню і саміх сувязей, і беларускай літаратуры ў прыватнасці. Дарэчы, загадчык аддзела літаратуры Інстытута, палкі прыхільнік і знаўца беларускай літаратуры дацэнт Ф. М. Небарачок, які быў галоўным арганізатарам і душой канферэнцыі, да апошняга часу ўзначальваў гэту кафедру. Безумоўна, даклад пра здабыткі львоўскіх беларусістаў будзе стаяць у праграме адной з наступных канферэнцый, якія вырашана арганізоўваць праз кожныя два гады. «Матэрыялы» Першай і «Тэзісы дакладаў» Другой канферэнцый, што выйшлі асобнымі брашурамі, падагульняюць ужо зробленае, скіроўваюць пошукі вучоных на даследаванне новых праблем.**

**Львоўская «залатая восень» на гэты раз падвяла: імжаў дождж, было халадна. Але ніякая непагадзь не магла астудзіць той цеплыні сапраўднай братэрскай дружбы, якая панавала на канферэнцыі, якая вось ужо пяцьдзесят гадоў яднае ў адну сям'ю ўсе народы Савецкага Саюза, у тым ліку украінскі і беларускі.**

**В. РАГОЙША,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**



*НА ЗДЫМКУ: удзельнікі канферэнцыі каля помніка выдатнаму украінскаму пісьменніку Івану Франко (Львоў).*

# МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ

14 кастрычніка у нашай краіне і ў многіх краінах свету шырока адзначаецца Міжнародны дзень стандартызацыі.

Няма такой сферы дзейнасці, дзе можна было б абысціся без стандартызацыі. Сталь і тканіна, вучнёўскія сшыткі і абутак, тэлевізары і станкі — на ўсё ёсць дзяржаўныя стандарты, выкананне якіх гарантуе безадказную службу і высокую якасць вырабаў.

Партыя і ўрад надаюць важнае значэнне развіццю стандартызацыі ў нашай краіне. Звыш 17 тысяч ГОСТаў, а таксама некалькі дзесяткаў тысяч рэспубліканскіх і галіновых стандартаў рэгламентуюць выпуск усіх важнейшых відаў прадукцыі. У нас пастаянна стандартызуюцца новыя віды прадукцыі, планамерна пераглядаюцца і абнаўляюцца паказчыкі дзеючых стандартаў. Упершыню ў свеце распрацоўваюцца цэлыя комплексы, сістэмы ўзаемазвязаных стандартаў, пры дапамозе якіх эфектыўна вырашаюцца народнагаспадарчыя задачы.

Так, укараняемая цяпер Адзіная сістэма канструктарскай дакументацыі (АСКД) — з ёй ужо пачалі знаёміцца студэнты вну краіны — дазваляе амаль на трэць зменшыць час распрацоўкі новых вырабаў, актыўна садзейнічае павышэнню якасці прадукцыі.

Значны эканамічны эфект прынясе распрацоўваемая ў цяперашні час Адзіная сістэма тэхналагічнай падрыхтоўкі вытворчасці (АСТПВ), якая рэзка скароціць тэрміны асваення новай тэхнікі.

Праграма па уніфікацыі, якая здзяйсняецца ў галіне машынабудавання, дазволіць перайсці да выпуску стандартных ўзаемазамяняемых вузлоў і дэталей машын у межах раду галін вытворчасці. Распрацоўкі ў галіне класіфікацыі і кадзіравання тэхніка - эканамічнай інфармацыі забяспечаць адзіную «мову» для аўтаматызаваных сістэм кіравання (АСК) на ўсіх узроўнях прадпрыемства, галіны народнай гаспадаркі ў цэлым.

Гэтыя сістэмы цесна звязаны і дапаўняюць адна другую. Яны поўнасцю ахопяць усе асноўныя этапы вытворчасці — ад рэалізацыі канструктарскай задумы да эксплуатацыі гатовага вырабу.

Роля стандартызацыі, аднак, не абмяжоўваецца рашэннем чыста ўнутраных народнагаспадарчых праблем. Яна садзейнічае развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхнікі, стварае спрыяльную глебу для ўстанаўлення знешнегандлёвых сувязей.

Савецкі Саюз актыўна ўдзельнічае ў рабоце пастаяннай камісіі СЭУ па стандартызацыі. СССР — член Еўрапейскай арганізацыі па кантролю якасці, Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі, адной з самых буйных арганізацый, якія распрацоўваюць міжнародныя стандарты. Гэта дзейнасць дазваляе атрымаць каштоўнейшую інфармацыю, якая плённа выкарыстоўваецца на ўсіх участках нашай народнай гаспадаркі.

Кола праблем, якія вырашаюцца сёння з дапамогай стандартызацыі, надзвычай вялікае. Яно закранае сферу дзейнасці ўсіх без выключэння людзей з вытворчасці, усіх спецыялістаў, якія, натуральна, павінны мець для гэтага адпаведную падрыхтоўку.

З 1972-73 навучальнага года да вывучэння курса стандартызацыі прыступілі студэнты ўсіх тэхнічных і эканамічных вну краіны. Гэта, несумненна, будзе плённа ўплываць на развіццё работ у гэтай галіне.

Адзначаючы важную ролю стандартызацыі, Савет Міністраў СССР прыняў рашэнне аб правядзенні ў нашай краіне 14 кастрычніка 1972 года Міжнароднага дня стандартызацыі. Гэты дзень з'явіцца аглядам усіх дасягненняў і магчымасцей айчыннай стандартызацыі.

*Прэс-цэнтр Дзяржстандарта СССР.*

# АЗБУКА ВУЛІЦЫ

Засталіся ззаду першыя дні студэнцкіх заняткаў. Прайшлі першыя хваляванні, першыя клопаты ў сувязі з пачаткам навучальнага года. Вы, дарагія сябры-студэнты, і асабліва тыя, хто прыехаў у Мінск з далёкіх вёсак, канешне ж, звярнулі ўвагу на яго незвычайны па сваёй інтэнсіўнасці рух.

Таму мы, работнікі міліцыі, віншуючы вас з уступленнем у вялікае і багатае ўражаннямі студэнцкае жыццё, разумеючы тое, што вы рыхтавалі сябе да пазнання не толькі цікавых, але і цяжкіх дысцыплін, рэкамендуем вам усё ж для вывучэння... азбуку. Гэта — азбука, ад ведання ці няведання якой могуць залежаць жыццё і здароўе людзей. Гэта — азбука вуліцы. Правілы, якія яна дыктуе, павінны свята выконваць як пешаходы, так і вадзіцелі. Гэта — правілы бяспекі руху. Той, хто забывае іх, нярэдка становіцца ахвярай няшчасных выпадкаў.

Надзвычай трывожным было становішча на вуліцах і дарогах Мінска ў мінулым месяцы. Семдзесят восем дарожна-транспартных здарэнняў, звыш шасцідзесяці раненых і пяць загінуўшых людзей — такія сумныя вынікі верасня. Віной усяму гэтаму ў шасцідзесяці працэнтах усіх выпадкаў былі няўважлівасць пешаходаў, неасцярожнасць іх, нежаданне лічыцца з законамі вуліцы.

Але бывае і так, што чалавек парушае правілы толькі таму, што недастаткова добра іх ведае. Таму сёння мы публікуем асноўныя патрабаванні, прад'яўляемыя да пешаходаў на вуліцы.

Самае важнае і самае першае, што павінен зрабіць пешаход перад тым, як перайсці вуліцу, гэта

— пераканацца ў поўнай сваёй бяспецы; не пераходзіць вуліцу перад надыходзячым транспартам; быць асабліва асцярожным пры абходзе транспартных сродкаў і іншых перашкод, якія абмяжоўваюць агляд праезджай часткі;

— пераходзіць вуліцу (дарогу) пешаходы павінны ў месцах, дзе ёсць лініі або ўказальнікі пераходаў, а дзе іх няма — на скрыжаваннях вуліц;

— пры наяўнасці пешаходных тунэляў трэба карыстацца толькі імі;

— там, дзе рух рэгулюецца, выходзіць на праезджую частку для пераходу вуліцы можна толькі пры зялёным сігнале светафора, светавога ўказальніка або дазваляючым жэсце рэгуліроўшчыка;

— пешаходы, не паспеўшыя закончыць пераход, павінны чакаць дазваляючага сігнала на сярэдзіне вуліцы або на астраўку бяспекі.

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

# У КЛУБЕ ТУРЫСТАЎ-АЛЬПІНІСТАЎ

Спорт

*Секцыя турызму-альпінізму БДУ нядаўна падрыхтавала справаздачу аб летнім перыядзе работы. Сёлета 30 членаў секцыі пабывала ў альпініцкіх лагерах Каўказа. З іх два чалавекі атрымалі другі разрад з перавышэннем, тры — другі разрад, 10 чалавек перавысіла трэці разрад.*

*13 спартсменаў у гэтым сезоне пакарылі сваю першую вяршыню. 18 дзён на вышыні 3.700 метраў М. Яўменчыкаў, У. Сіроцін, Я. Ціткін, А. Раготнер вялі назіранне на маршруце шостай катэгорыі складанасці на вяршыню Чатын.*

*Альпіністы універсітэта зрабілі перавальныя паходы, у час якіх былі вывучаны раёны Цэнтральнага і Заходняга Каўказа, складзены апісанні перавалаў і іх картасхемы. Яны спатрэбяцца на другое лета тым, хто пажадае адправіцца ў падарожжа па Каўказу.*

*Гэты навучальны год прывёў у секцыю каля 30 новых членаў. Вяршыні Каўказа чакаюць іх, а пакуль — трэніроўкі, трэніроўкі... у спартыўнай зале, у парку, у Раўбічах, дзе сцены былога касцёла адыгрываюць ролю прыродных вяршынь.*

*Т. ЗАСІМ.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 02376 Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.
Зак. 1174. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз.